Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 ВЕРАСНЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 182 (29296)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TVПРАГРАМА



ЯК «ПАМІРЫЦЬ» КАРТКІ 4

НАДЗЁННЫЯ ТУРБОТЫ МЯСЦОВЫХ УЛАД МС



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КАРАНІК, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:**

*«Асабістыя прыёмы, прамыя лініі — гэта добры механізм аператыўнай сувязі, калі людзі могуць адкрыта расказаць пра свае праблемы прадстаўнікам улады і атрымаць зваротную сувязь у выглядзе вырашэння праблемы або тлумачэння тых ці іншых нюансаў. Прамая лінія ў першую чаргу накіравана на дапамогу тым, хто апынуўся ў няпростай жыццёвай сітуацыі. Прычым часам, каб зняць вастрыню праблемы, дастаткова своечасова праінфармаваць людзей, якія ёсць шляхі вырашэння, што для гэтага робіцца».*

## Палескі пантэон



Крэатыўным фантазіям сямідзесяцівасьмігадовага жыхара вёскі Цераблічы Столінскага раёна Івана СУПРУНЧЫКА няма межаў. Сякеры ў яго руках падпарадкоўваецца любое дрэва, ажыццяўляецца самая выкшталцоная задума творцы. Нядаўна, на фестывалі «Кліч Палесся» Іван Піліпавіч выставіў сваю новую серыю драўляных скульптур на тэму старажытнай міфалогіі Палесся. За сваё самабытнае мастацтва, якое называюць інсітным, народным, аўтэнтычным, Іван Супрунчык атрымаў званні не толькі народнага майстра Беларусі, але і «Ганаровага Палешука».

Мала хто ведае, асноўным прафесійным заняткам цераблiцкага жыхара была і ёсць бібліятэчная справа —- роўна пяцьдзясят гадоў, як Іван Піліпавіч на пасадзе вясковага бібліятэкара, прычым працуе ён усе гэтыя гады на адным месцы.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• **Упаўнаважаным прадстаўніком кіраўніка дзяржавы ў Брэсцкай вобласці прызначаны дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Валерый Вакульчык, у Магілёўскай вобласці — намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Сівак.**

• Копію крыжа Ефрасінні Полацкай прывязуць у Брэст. Святыня будзе знаходзіцца ў кафедральным саборы прападобнага Сімяона Стоўпніка. Сустрэча копіі крыжа намечана 24 верасня на 17.00. Яе праводзіны адбудуцца на наступны дзень у 14.30.

• **Тэмпературны рэкорд 72-гадовай даўніны пабіты ў Мінску. Тэмпература паветра 16 верасня ў сталіцы прагрэлася да 26,2 градуса. Раней самым цёплым лічыўся гэты дзень у 1948 годзе, калі было 25 градусаў вышэй за нуль.**

Рэпарцёр

## НАВАТ ЯГАДЫ Ў ШОКУ

### Карэспандэнт «Звязды» паназірала за тым, як нарыхтоўваецца вітамінная прадукцыя на адным з пасляховых прадпрыемстваў спажыўкааперацыі

**«Глускі кошык» — адно з тых прадпрыемстваў, якія на слыху. Менавіта пад гэтай маркай мясцовая райспажыўкааперацыя пастаўляе на нашы прылаўкі тоны замарожанай прадукцыі. Учора гэта былі садовыя ягады, хутка з'явяцца журавіны. Так што гаспадыні могуць не турбавацца — зімой у іх будзе чым упрыгожыць салодкія стравы.**

Лічбы гавораць самі за сябе. Нарыхтоўчы абарот за восем месяцаў склаў тут 109,6 % у параўнанні з леташнім! Чарніц закуплена 220 тон — на 20 тон болей, чым летась, у разгары нарыхтоўка яблыкаў — у планах закупіць 370 тон. Клубніц нарыхтавалі сёлета 22 тоны і амаль усю прадалі на рынках у Мінску, Магілёве і Бабруйску. На замарозку пайшло толькі чатыры тоны. Прымалі тут таксама чорныя і чырвоныя парэчкі, брусніцы, зараз ідзе нарыхтоўка самай карыснай беларускай ягады — журавін. Наперадзе закладка бульбы, буракоў, морквы, цыбулі, яблыкаў — таварыства робіць свае запасы, каб потым спакойна гандляваць імі зімой: дэфіцыту вітамінаў у крамах Глускага райспажыўтаварыства дакладна не будзе.

СТАР. 5

Кузня чэмпіёнаў

## Ураджай з хакейнага поля

### Чым жыве баранавіцкі хакей на траве і чаго яму не хапае для поўнага шчасця



СТАР. 23

ISSN 1990 - 763X
20182>

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!
Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

# «Баючыся адказнасці, многія абвясцілі гэты дзень санітарным»

**Генеральная пракуратура адрэагавала на заклікі да парушэння нармальнай работы прадпрыемстваў, паведаміла журналістам начальнік аддзела інфармацыі Генпракуратуры Анжаліка КУРЧАК.**

«У сераду ў асобных месенджарах паведамілі аб правядзенні ў краіне агульнанацыянальнай акцыі салідарнасці і канстатавалі, што 16 верасня многія кампаніі абвясцілі нерабочым днём. Адзначу, што лакаматывы нацыянальнай эканомікі падобным правакацыйным укідам ніколі не паддаваліся і не схільныя паддавацца цяпер», — сказала Анжаліка Курчак.

Фактычна ўдзельнікамі акцыі сталі некалькі кавярняў, дробных крамаў і студый у Мінску. Пры гэтым, баючыся адказнасці, многія абвясцілі гэты дзень санітарным. Ва ўсіх іншых рэгіёнах краіны арганізацыі гандлю, аказання паслуг працавалі ў звычайным рэжыме.

«Пракуроры неадкладна адрэагавалі на заклікі да парушэння нармальнай дзейнасці прадпрыемстваў і правоў грамадзян на атрыманне паслуг, — адзначыла начальнік аддзела інфармацыі. — Аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму даручана ўзмацніць кантроль за выкананнем суб'ектамі гаспадарання парадку работы, аказання паслуг, а таксама правоў наёмных работнікаў. Пры выяўленні парушэнняў вінаватыя будуць прыцягнутыя да ўстаноўленай законам адказнасці».

Анжаліка Курчак дадала, што ў залежнасці ад характару работы таго ці іншага суб'екта гаспадарання сапраўды прадугледжана правядзенне санітарных дзён, што рэгулюецца заканадаўствам. «Пры парушэнні такога парадку будуць прымацца меры рэагавання ў мэтах забеспячэння паўнаты правоў грамадзян на атрыманне паслуг», — сказала яна.

**БелТА.**

## Меркаванне

# «Неабходна ў першую чаргу ацэньваць эканамічныя рызыкі»

**Таццяна РУНЕЦ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:**



— З пункту гледжання макраэканомікі і эканомікі асобна ўзятага прадпрыемства ўсе дэструктыўныя заклікі не працаваць, парушыць ці сабатаваць тэхналагічныя працэсы на вытворчасці выглядаюць няслушнымі. Наступствы могуць быць самыя сумныя для ўсёй сацыяльна-эканамічнай сістэмы.

Такая структура беларускай эканомікі. У нас ёсць шэраг буйных прадпрыемстваў у нафтаперапрацоўцы і нафтахіі, металургіі, машынабудаванні, горназдабываючай прамысловасці, на якіх працуе вялікая колькасць людзей. Часта гэтыя прадпрыемствы з'яўляюцца горадаўтваральнымі і ўяўляюць сабой найскладанейшыя тэхналагічныя комплексы. Іх асаблівасць у тым, што спыненне вытворчасці, нават кароткатэрміновае, можа прывесці да значных выдаткаў, звязаных з наступным узнаўленнем вытворчых працэсаў.

У эканоміцы ёсць такое паняцце як «эфект маштабу», калі з кожнай дадатковай адзінкі вытворчай прадукцыі зніжаюцца ўдзельныя пастаянныя выдаткі, а значыць, і сабекошт тавару. У выніку так званых «акцый салідарнасці» гэты эфект будзе зведзены да нуля, цанавая канкурэнтаздольнасць беларускай прадукцыі знізіцца. Мы проста страцім рынкі, якія заваёўвалі не адзін год. Акрамя таго, зніжэнне аб'ёму выпуску, хутчэй за ўсё, абумовіць невыкананне ў тэрмін экспартных кантрактаў. І гэта ўжо рэпутацыйныя страты прадпрыемства, якія нельга вымярыць выключна грашыма і папоўніць вельмі няпроста.

## Міжнародны вектар

# «НА ЎСЁ ЁСЦЬ СУД ГІСТОРЫІ»

### Міністэрства замежных спраў пракаментавала рэзалюцыю Еўрапарламента па Беларусі

**МЗС адзначае, што дакумент носіць відавочна агрэсіўны характар і не ўтрымлівае ні аднаго канструктыўнага альбо ўзважанага тэзіса.**

«Нават, калі б і хацелася, то абаперціся ў ім няма на што. Аналіз проста падменены наборам эмацыянальных прапаноў, прытым такіх, што «хто ў лес, хто па дровы», і заклікае ў нікуды. Таксама еўрапарламентарыям не перашкодзіла б мінімальнае веданне міжнароднага права і павага да суверэнітэту іншых краін. Гэтыя якасці значна лепш сапраўды спрыяюць прагрэсу ў міждзяржаўных адносінах, чым прадэманстраванае жаданне ўльтыматыўна навязваць сваё меркаванне, кіраваць светам ці хоць бы ўсёй Еўразіяй», — гаворыцца ў каментарыі.

Беларускае знешнепалітычнае ведамства расчараванае, як Еўрапарламент, «які пазіцыянуе сябе ў якасці сур'ёзнай, аб'ектыўнай і дэмакратычнай структуры, не змог знайсці ў сабе палітычнай волі зазірнуць далей за свой нос, пераадолець аднабокасць і не стаць закладнікам штампаў».

«На жаль, мы таксама пераканаліся ў неразуменні працэсаў, якія адбываюцца ў Беларусі, і абсалютнай адарванасці ад рэалій, за што гэты орган часта крытыкуюць грамадзяне ўнутры самога ЕС. Недасканаласць заклікаў да санкцый і згортвання адносін для інтарэсаў людзей з Еўропы і Беларусі зусім відавочная, — падкрэслена ў заяве МЗС. — Але, зразумела, што еўрапарламентарыі, у адрозненне ад бізнесу і простых грамадзян, на сабе гэта не адчуюць, таму так лёгка жанглююць гэтымі катэгорыямі. Але на ўсё ёсць суд гісторыі».

Прадстаўнікі міністэрства дадаюць, што замест прыняцця падобных дакументаў варта было б задумацца пра тое, як рэальна падтрымаць суверэнітэт, незалежнасць і стабільнасць свайго суседа, тым самым унесці ўклад у стабільнае і ўстойлівае развіццё свайго ж еўрапейскага кантынента.

Учора еўрапарламентарыі прагаласавалі за прынцце праекта рэзалюцыі, у якой аспрэчваюцца вынікі прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі і «асуджаюцца беларускія ўлады за жорсткае падаўленне мірных пратэстаў». Прынятая рэзалюцыя носіць рэкамендацыйны характар, неабавязковая да выканання краінамі-членамі і інстытутамі ЕС.

# У клінічным выпрабаванні возьмуць удзел сто добраахвотнікаў

### Беларусь праводзіць экспертызу дакументаў на расійскую вакцыну супраць COVID-19

**Міністэрства аховы здароўя Беларусі атрымала пакет дакументаў для правядзення клінічнага выпрабавання вакцыны «Гам-Ковід-Вак» расійскай вытворчасці. Мяркуецца, што ў клінічным выпрабаванні вакцыны ў Беларусі возьме ўдзел каля сотні нашых суайчыннікаў.**

Вядучымі спецыялістамі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь праводзіцца экспертыза дакументаў шматцэнтравага клінічнага выпрабавання камбінаванай вектарнай вакцыны для прафілактыкі каранавіруснай інфекцыі, выкліканай вірусам SARS-CoV-2, паведамляе прэс-служба міністэрства. У склад экспертнай групы ўваходзяць спецыялісты УП «Цэнтр экспертыз і выпрабаванняў у ахове здароўя», а таксама вядучыя спецыялісты ў галіне эпідэміялогіі і інфекцыйных хвароб.

Пры выкананні экспертных работ будзе ацэнена магчымасць атрымання падчас клінічнага выпрабавання дакладных даных аб эфектыўнасці і бяспецы вакцыны, а таксама этычныя пытанні правядзення выпрабавання, пытанні абароны правоў і бяспекі ўдзельнікаў выпрабавання.

Даследаванне вакцыны плануецца правесці ў падвойным сляпым плацэба-кантраляваным дызайне. Гэта выпрабаванне будзе часткай буйнамаштабнага даследавання вакцыны «Гам-Ковід-Вак», якое праводзіцца на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі.

Плануецца, што ў Беларусі ў даследаванне будзе ўключана каля 100 удзельнікаў. Ахвотныя прыняць удзел у вакцынацыі могуць падаваць заяўкі на сайтах арганізацый аховы здароўя, якія выбраны ў якасці даследчых цэнтраў: 1-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі Цэнтральнага раёна Мінска, 4-й гарадской паліклінікі Мінска, 5-й гарадской клінічнай паліклінікі Мінска, 14-й цэнтральнай раённай паліклінікі Партызанскага раёна Мінска, 19-й цэнтральнай раённай паліклінікі Першамайскага раёна Мінска, 28-й раённай паліклінікі Мінска, Мінскай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга абласной клінічнай бальніцы, Віцебскай абласной клінічнай бальніцы.

**Алена КРАВЕЦ.**

## Новыя магчымасці

# ЛІШНІХ ВЕДАЎ НЕ БЫВАЕ!

**У БДУ паспяхова рэалізуецца праект па вывучэнні студэнтамі дадатковых дысцыплін.**

З 2019 года Белдзяржуніверсітэт дае магчымасць навучэнцам пашырыць свае веды за кошт асваення навучальных курсаў іншых факультэтаў. На дадзены момант спіс па выбары ўключае ўсе адукацыйныя дысцыпліны, акрамя замежных моў. Таксама запушчана платформа электроннага раскладу: яна дазваляе студэнтам з улікам выбраных дадатковых дысцыплін фарміраваць графік іх наведвання і суадносіць яго з заняткамі па асноўнай спецыяльнасці.

Навучанне па дадатковых праграмах не абмяжоўваецца курсам. Напрыклад, першакурснік можа абраць дысцыпліны, якія вывучаюцца чацвёртакурснікамі, і наадварот.

Нароўні з вочным наведваннем заняткаў для навучання сёння актыўна выкарыстоўваецца анлайн-форма. Дыдактычны матэрыял па шэрагу курсаў размешчаны на адукацыйнай платформе LMS Moodle. Тэхнічная база дазваляе выкладчыку кансультаваць, правяраць выкананне заданняў, арганізоўваць самастойную працу студэнтаў і ў хуткім рэжыме забяспечваць іх патрэбнымі матэрыяламі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### На аднаўленне глабальнай эканомікі спатрэбіцца пяць гадоў




Аднаўленне сусветнай эканомікі ад крызісу, выкліканага пандэміяй каранавіруса, можа расцягнуцца на пяцігодку. Аб гэтым заявіла галоўны эканаміст Сусветнага банка Кармэн Рэйнхарт. «Верагодна, адбудзецца хуткі адскок на фоне адмены ўсіх абмежавальных мер, звязаных з карантынам, але поўнае аднаўленне зойме да пяці гадоў», — цытуе эканаміста агенцтва Reuters. Пры гэтым Рэйнхарт прагназуе, што пасля крызісу ўзровень беднасці ў свеце вырасце ўпершыню за 20 гадоў. На думку эканаміста, крызіс, выкліканы пандэміяй, узмоцніць няроўнасць у свеце. Як вядома, Сусветны банк у чэрвені паведаміў, што ў 2020 годзе чакаецца рэкордны спад глабальнай эканомікі з часоў Другой сусветнай вайны — на 5,2 працэнта замест росту на 2,5, які чакаўся ў студзені.

### Барбадас вырашыў стаць рэспублікай

Астраўная дзяржава Барбадас мае намер стаць рэспублікай, у выніку чаго каралева Лізавета ІІ больш не будзе кіраўніком краіны, паведамілі мясцовыя ўлады. «Прыйшоў час цалкам пазбавіцца ад свайго каланіяльнага мінулага», — адзначаецца ў заяве ўрада. Улады плануюць завяршыць неабходныя юрыдычныя працэдуры да лістапада 2021-га, калі краіна будзе святкаваць 55-ю гадавіну незалежнасці ад Вялікабрытаніі. У заяве прэм'ер-міністра краіны Міі Мотлі гаворыцца, што жыхары краіны хочуць бачыць кіраўніком дзяржавы барбадосца. Букінгемскі палац



заявіў, што рашэнне аб пераходзе ў статус рэспублікі — прэрагатыва ўрада і жыхароў краіны. Барбадас атрымаў незалежнасць у 1966 годзе, але захаваў фармальную сувязь з брытанскай манархіяй разам з некаторымі іншымі краінамі, якія ўваходзілі ў Брытанскую імперыю. Астраўная дзяржава — не першая былая калонія Брытаніі ў Карыбскім рэгіёне, якая рашыла стаць рэспублікай. У 1970-м так паступіла Гаяна (праз чатыры гады пасля атрымання незалежнасці), у 1976-м — Трынідад і Табага, у 1978-м — Дамініка.

### Дым ад лясных пажараў у ЗША дасягнуў Паўночнай Еўропы

У мінулыя выхадныя дым ад прыродных пажараў, якія пачаліся на Заходнім узбярэжжы ЗША, дасягнуў Паўночнай Еўропы, паведаміла еўрапейская служба маніторынгу атмасферы «Капернік» (CAMS). Паводле яе даных, на працягу гэтага тыдня дым зноў перасячэ Атлантыку і да выхадных дабярэцца да Еўропы. CAMS адзначае, што сёлета пажарная актыўнасць у ЗША ў дзясяткі, а то і ў сотні разоў перавышае паказчыкі апошніх сямнаццаці гадоў.



Акрамя таго, выкіды вуглароду ў выніку пажараў у штатах Каліфорнія і Арэгон у 2020-м аказаліся найвышэйшымі з пачатку маніторынгу CAMS у 2003-м. «Той факт, што гэтыя пажары выкідваюць у атмасферу столькі забруджвальнікаў, што мы можам бачыць густы дым на адлегласці больш за восем тысяч кіламетраў, адлюстроўвае тое, наколькі яны разбуральныя па сваёй велічыні і працягласці», — падкрэсліў старшы навуковы супрацоўнік CAMS Марк Парынгтан. Прыродныя пажары ахапілі Заходняе ўзбярэжжа ЗША ў жніўні, больш за ўсё пацярпелі Каліфорнія і Арэгон. Ахвярамі агню сталі больш за 30 чалавек, некалькі дзясяткаў лічацца зніклымі без вестак.

Тэхналогія

# ЗАПРАВІЦЬ БЯСПЛАТНА, АЛЕ З ДАПАМОГАЙ ТЭСТАВАЙ КАРТЫ

**З наступнага панядзелка зарадзіць электрамабіль на ўсіх 267 ЭЗС сеткі Malanka можна будзе толькі з дапамогай мабільнай праграмы, але па-ранейшаму бясплатна. Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміла медыядырэктар PR-студыі Sette Кацярына СЫЧУК.**

Каб скарыстацца паслугай, усім уладальнікам электракараў неабходна не толькі спампаваць праграму ў Apple Store і Play Market і зарэгістравацца ў ім, але таксама ўвесці наступныя дадзеныя тэставай плацежнай карты: нумар карты, імя і прозвішча, тэрмін дзеяння і CVC.

Цяпер зарадзіць электрамабіль на большасці станцый можна непасрэдна скарыстаўшыся пісталетам і націснуўшы кнопку «Пуск». З 21 верасня ЭЗС сеткі Malanka будуць працаваць па-новаму, толькі праз праграму. Працэс пераводу на новы рэжым ЭЗС праходзіць у два этапы: 15—16 верасня ён здзяйсняецца ў рэгіёнах, з 16 па 21 верасня — у Мінску.

У кампаніі тлумачаць, што гэта трэба для таго, каб пратэсціраваць працу ЭЗС, мабільнай праграмы, сістэмы аплаты і пазбегнуць магчымых цяжкасцяў у кіроўцаў, калі зарадка будзе аплачвацца ўжо з асабістай банкаўскай карткі ўладальніка электракара.

Кацярына Сычук таксама адзначыла, што ў перыяд дзеяння тэставай карты кіроўцы электракараў будуць атрымліваць абвесткі на сваё мабільныя прылады аб тым, што зарад пачаўся, колькі кілават на гэты момант зараджана, якая сума будзе спісаная. У кампаніі мяркуюць, што аплата пры дапамозе толькі мабільнай праграмы дазволіць кіроўцам адаптавацца да новых умоў водпуску зарада, і, калі платныя тарыфы будуць уведзены, гэта дазволіць пазбегнуць памылак у карыстанні ЭЗС.

Калі ў кіроўцаў узнікнуць пытанні аб рабоце праграмы, задаць іх можна будзе ва ўкладцы «Служба падтрымкі», там жа іх можна будзе праілюстраваць фотаздымкамі. Спецыялісты ЭЗС Malanka аператыўна адрэагуюць і дапамогуць вырашыць праблему. Таксама ў любы час сутак можна скарыстацца тэлефонам: +375(33-29-25) 6-431-431 або напісаць на электронную пошту contact@beloil.by.

На дадзены момант самая распаўсюджаная праблема на ЭЗС — гэта кнопка спынення працэсу зарадкі. Калі кіроўцы націскаюць на кнопку і забываюць яе адціснуць, то ў праграме гэтая станцыя аўтаматычна становіцца недаступнай. Каб гэтага пазбегнуць, у Malanka просяць быць уважлівымі да абсталявання на ЭЗС.

У кампаніі Malanka нагадваюць, што з цягам часу цана 1кВт на станцыях пастаяннага току (хуткія ЭЗС) складзе 39 капеек, на станцыях пераменнага току (павольныя) — 29 капеек. Разам з тым такія станцыі будуць адпускаць электраэнергію для зараду па сесіях — гэта значыць да неабходнага ўзроўню зарадкі. На павольных ЭЗС цана адной сесіі складзе 5,46 рубля, на хуткіх — 7,34 рубля незалежна ад колькасці адпушчаных кВт/г. Паралельнае існаванне двух варыянтаў аплаты ўвядуць, каб вызначыць, які з іх будзе больш папулярны сярод спажыўцоў, і ў выніку пакінуць самы зручны варыянт.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Конкурс

# «АТАМНЫЯ» ТВОРЫ Ў МАЛЮНКАХ І НА КАМП'ЮТАРЫ

**Іх заклікаюць дасылаць на конкурс «Тэхналогіі, якія мяняюць свет» Дзяржкарпарацыя «Расатам» і інфармацыйны цэнтр па атамнай энергіі (ІЦАЭ) у Мінску. Як сцвярджаюць яго арганізатары, творчае спаборніцтва прымеркавана да 75-годдзя атамнай галіны — з мэтай падкрэсліць важнасць ядзерных тэхналогій у паўсядзённым жыцці.**



— Атамная галіна — высокатэхналагічная сфера, якая ўжо шмат дзесяцігоддзяў дэманструе ўпэўнены і дынамічны прагрэс. Ядзерныя тэхналогіі сталі надзейнай крыніцай энергіі, яны садзейнічаюць навуковым даследаванням, новым адкрыццям у прамысловасці, медыцыне, сельскай гаспадарцы, у асваенні космасу, — падкрэсліў **Уладзімір ГОРН, намеснік дырэктара аб'яднання «Расатам Усходняя Еўропа».** — Асаблівая цікавасць да высокіх тэхналогій заўжды была ў моладзі, а атамная галіна — невычэрпная крыніца натхнення для крэатыўных і творчых людзей. Энтузіязм моладзі ў спалучэнні з вопытам прафесіяналаў, несумненна, пасадзейнічае далейшаму развіццю атамнай сферы.

Арганізатары разлічваюць, што ўдзельнікамі конкурсу стануць дзеці ад шасці гадоў, падлеткі і моладзь ва ўзросце да 31 года. Чакаецца, што на тэмы, звязаныя з атамнай галіной (адказная праца атамшчыкаў, распаўсюджванне атамных тэхналогій у неэнергетычныя сферы, атам у штодзённым жыцці і іншыя), пафантазіруюць удзельнікі з усіх куткоў Беларусі.

Работу можна выканаць любымі мастацкімі сродкамі або з дапамогай камп'ютарнай графікі. Творы прымаюцца да 30 кастрычніка на адрас: 220114, г. Мінск, вул. Макаёнка, 12, Установа адукацыі «Рэспубліканскі цэнтр інавацыйнай і тэхнічнай творчасці» з адзнакай «Інфармацыйны цэнтр па атамнай энергіі». Віртуальныя работы можна дасылаць на электронную пошту: icao.by@tut.by.

Для ўдзелу ў конкурсе неабходна зарэгістравацца. Больш падрабязна даведацца пра правілы і ўмовы спаборніцтваў можна на старонцы адукацыйнага праекта Дзяржкарпарацыі «Расатам» Look Around Belarus.

Найлепшых аўтараў журы вызначыць у лістападзе. Суддзі будуць ацэньваць арыгінальнасць ідэі, майстэрства выканання задумы і раскрыццё тэмы. Пераможцы атрымаюць дыпломы і падарункавыя сертыфікаты.

**Ірына СІДАРОК.**

А не шкодзь!

# Браканьерскае паляванне — нелегалы забілі чатырох ласёў

**Паляўнічы сезон набірае абароты — ужо сёння здабываць можна нямала жывёл і птушкі, з 19 верасня да спіса дазволеных для палявання відаў дададуцца розныя віды гусей, а з 1 кастрычніка стартуе загоннае паляванне на капытных.**

Аднак не ўсе паляўнічыя законапаслухмяныя. Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету паведаміла пра апошнія выпадкі браканьерства.

Так, раніцай на полі каля вёскі Драбаўшчына ў Клецкім раёне супрацоўнікі мясцовай паляўнічай гаспадаркі выявілі тушу лася-сяголетка, парэшткі яшчэ аднаго маладога лася былі схаваныя непадалёку ў саломе. Жывёлы загінулі ад кулявых раненняў, але калі стрэліць — справа секундная, то на разбор дзвюх туш у браканьераў, мабыць, не хапіла часу. Ласяняты, якія не пражылі і года, сталі ахвярай чалавечай сквапнасці.



Напаўразабраную тушу лася, якую таксама кінулі браканьеры, знайшоў на беразе возера Кажыева ў Гомельскім раёне мужчына-грыбнік. Ён, як відаць, і спудзіў парушальнікаў — тыя вырашылі лепш расстацца са здабычай, чым быць заспетымі знянацку.

У абодвух выпадках інспектары выявілі доказы, якія дапамогуць расследаваць факты незаконных паляванняў. Распачаты крымінальныя справы.

А вось чатырох братоў з пасёлка Васілевічы Рэчыцкага раёна ўзялі з доказамі злачынства. Двое старэйшых — паляўнічыя з зарэгістраванымі стрэльбамі, але купляць пуцёўку і дазвол на здабычу буйной дзічыны не палічылі патрэбным. Больш за тое, мужчыны загадзя прадумалі, як схаваць сляды браканьерства. Адзін адправіўся ў лес, дзе і падстрэліў ласіху, затым вярнуўся дадому, памыў вопратку і пачысціў стрэльбу. Пасля гэтага ўжо на іншай машыне браты паехалі па здабычу, тушу разабралі і даставілі ў дачны дом.

Але ўсе гэтыя хітрыкі не дапамаглі. Аб незаконным паляванні стала вядома праваахоўнікам — на затрыманне чатырох братоў-браканьераў выехала група інспектараў Мазырскай міжрайінспекцыі, участковы міліцыянер і паляўнічазнавец. У парушальнікаў канфіскавалі 76 кілаграмаў мяса дзічыны, дзве стрэльбы, чатыры нажы і сякеру. Браты панясуць крымінальную адказнасць, за здабытага лася ім давядзецца пакрыць больш за восем тысяч рублёў у якасці нанесенай прыродзе шкоды. А тыя з іх, хто з'яўляўся паляўнічымі, будуць пазбаўленыя гэтага права.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Слова — чытачам «Звязды»

# «ПРАПАНУЮ ЭКСКЛЮЗІЎНЫ ПРАЕКТ «МІРСКІ ЗАМАК» СА «ЗВЯЗДОЙ»



**Аляксандр ЛОЙКА, дырэктар музея Замкавы комплекс «Мір»:**

— Аб нашым комплексе пішуць нямала. І гэта ўвогуле апраўдана, бо «Мір» — адзін з самых велічных і шматфункцыянальных старажытных замкаў Беларусі. Шмат інфармацыі было і падчас яго рэканструкцыі і пазней, калі комплекс пачаў прымаць шматлікіх турыстаў. Таму ўвага да гісторыка-культурнай каштоўнасці відавочная. Але запамінаецца далёка не ўсё з таго, аб чым пішуць ці здымаюць відэасюжэты. І ўсё ж некаторыя матэрыялы застаюцца ў памяці. У тым ліку карэспандэнтаў «Звязды». Магу прыгадаць даволі цікавы і вельмі шчымлівы артыкул у газеце, дзе расказваецца аб гісторыі замка часоў вайны, калі тут знаходзілася яўрэйскае гета. Гэта старонка яшчэ і гераічная. Чытачы «Звязды» змаглі даведацца аб учынку маладога арганізатара супраціўлення, з дапамогай якога каля двухсот яўрэйскіх вязняў апынуліся на волі. Дарэчы, у нашым музеі зроблена экспазіцыя на гэтую тэму і захоўваецца нямала ўнікальных экспанатаў.

Сёння замак — гэта тэматычныя экскурсіі, тэатралізаваныя прадстаўленні, музейныя заняткі. Заваявалі папулярнасць вядомыя на ўсю Беларусь музычныя вечары. Ды і сама гісторыя старажытнага замка XVI—XX стагоддзяў цікавая. Мірскі замак уключаны ў Спіс Сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Таму хачу звярнуцца з эксклюзіўнай прапановай. Лічу, што старажытны Мірскі замак і найстарэйшая ў краіне газета «Звязда» маюць усе падставы для таго, каб стварыць агульны праект, які будзе цікавы ўсім чытачам. У рэшце рэшт мы ўсе скіраваны на тое, каб садзейнічаць развіццю турыстычнага патэнцыялу нашай краіны, нам ёсць аб чым расказаць і чым ганарыцца.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Надвор'е

# Уначы месцамі толькі плюс 2

**Чым больш каляндарныя лісты аддзяляюць нас ад лета, тым карацейшыя становяцца дні. А «кароткае» сонца нясе з сабой сезоннае пахаладанне. У гэтыя выхадныя будзе зусім не цёпла. У гэтым можна вінаваціць моцны паўночны вецер, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



На выхадныя надвор'е ў краіне ў асноўным будзе фарміраваць вобласць павышанага атмасфернага ціску. У суботу чакаецца пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў. Вецер паўночна-заходні, заходні ўмераны, удзень парывісты. Мінімальная тэмпература паветра ўначы ад плюс 2 да 9 градусаў цяпла, а максімальная ўдзень будзе ў межах 14—20 цяпла.

Пры пераменнай воблачнасці не будзе ападкаў і ў нядзелю. Вецер чакаецца слабы, няўстойлівы. Мінімальная тэмпература паветра ноччу — 2—9 цяпла, максімальная ўдзень — ад плюс 15 да 20 градусаў, па поўдні краіны — да 22 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня змяненняў умоў надвор'я не чакаецца. У панядзелак будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі туман. Уначы прагназуецца ад плюс 3 да плюс 9 градусаў, ва ўсходніх раёнах месцамі магчымыя слабыя замаразкі да нуля — мінус 2 градусаў. Удзень будзе плюс 14—19, па паўднёвым захадзе — да плюс 22 цяпла. У аўторак будзе сонечна і суха. Уначы холадна, а ўдзень — на пару градусаў цяплей, чым у выхадныя.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ЯК «ПАМІРЫЦЬ» КАРТКІ

## Што рабіць, каб пры аплаце праезду не спісаліся грошы з іншага «пластыку»

**У гарадскога жыхара абавязкова ёсць цэлы стос пластыкавых картак: банкаўскіх, праязных, дысконтных... У гэтым выпадку спатрэбяцца своеасаблівыя візітоўніцы — аксесуары, якія здаўна лічыліся адной з прыкмет сацыяльнага і дзелавога статусу.**
**Статус — яно, вядома, добра, але, як выявілася, яшчэ і небяспечна. Я прывык, «разлічваючыся» з метрапалітэнам або з аўтобусам, падносіць да валідатара ўсю візітоўніцу.**
**А каб пазбегнуць непажаданага спісвання паездак або грашовых сродкаў, неабходна прыкладаць да валідатара толькі тую картку, з дапамогай якой пасажыр жадае аплаціць праезд. Атрымліваецца, трэба яе шукаць і даставаць са «сховішча», што само па сабе зусім нязручна. Аб гэтай праблеме мы пісалі год таму. Ці змянілася што за гэты час?**




### Тэарэтычна праблемы няма

Гэтай тэмай зацікавіліся прафесіяналы-электроншчыкі. Яны высвятлілі: калі ў кашальку дзве карткі: бескантактавы праязны, банкаўская картка, любыя іх спалучэнні — з якой спішацца паездка?

На гэтае пытанне ніхто адназначна не адказаў. Спецыялісты казалі пра фізічныя працэсы. Ёсць рыдэр — ён жа валідатар — ён выпраменьвае хвалю; ёсць картка — пасіўная прылада. Калі картка трапляе ў хвалю — з'яўляецца ток, і яна пачынае працаваць. Якая картка адрэагуе першай, залежыць ад шматлікіх фактараў: ад таўшчыні кашалька, ад таго, з якога боку ляжаць карткі, ці няма фольгі або іншых праслоек, ад якасці чыпа і антэны. У розных банкаў дакладна розныя карткі: розныя вытворцы, чыпы, антэны. Таму нельга прадказаць, з якой карткі спішацца аплата. Тая, якая першай адгукнецца, — яна і «пераможа».

У бескантактавых тэхналогіях ёсць такі працэс: антыкалізія. Вось гэта і ёсць той механізм, які дазваляе выбраць адну картку, калі ў электрамагнітнае поле трапляюць адначасова некалькі. Але гэта ў лабараторных умовах, «у вакууме». А калі карткі ў вас у кашальку, то антыкалізія можа і не спрацаваць: дапусцім, адна картка ляжыць за міліметр ад вокладкі, а другая — за пяць міліметраў, — сігнал проста можа не дайсці. Па правілах плацежных сістэм, калі ў полі апынуліся дзве карткі, то рыдэр не павінен прымаць ні адну з іх. Спрацуе антыкалізія, з'явіцца надпіс «Адмова» або аналагічны. З банкаўскай карткай мы можам працаваць толькі тады, калі выразна разумеем, што ў полі яна адна. І пакуль картка не выйдзе з поля, ніякая іншая картка ў аплаце ўдзельнічаць не будзе. Гэта так, у тэорыі...

### Пагуляць у рулетку

А калі ў вас у кашальку некалькі картак, а ў руках, да прыкладу, лёгкія дрыжыкі — то аплата можа быць паслядоўна спісана і два разы: гэта будзе расцэнена як «прыклаў картку — прыбраў — зноў прыклаў».

З транспартнай карткай сітуацыя іншая, таму што чып у ёй больш просты, і гэты «пластык» можа спрацаваць хутчэй, чым банкаўскі, хоць правілы антыкалізіі распаўсюджваюцца і на яго. І калі ў нас дзве карткі — БСК (бескантактавая смарт-карта) і банкаўская — то ў такім выпадку якраз пачынаюць дзейнічаць сіла хвалі, хуткасць рэагавання і гэтак далей. Так што, калі хочаце пагуляць у рулетку, прыкладвайце кашалёк з некалькімі карткамі. Таму і ў нас, і ў іншых краінах карыстальнікаў папярэджваюць: «Паважаныя пасажыры, перад аплатай падрыхтуйце тую картку, якой хочаце аплаціць праезд».

### Прымусіць картку «не адказваць»

Выйсце, праўда, ёсць і з гэтай сітуацыі. Трэба проста «адвязаць» сваю картку ад аўтаматычнай паслугі. Здаецца проста? Не зусім.

Спачатку трэба зарэгістравацца ў асабістым кабінеце пасажыра. Для гэтага пераходзім на сайт payBYcard.by і рухаемся ў раздзел «Рэгістрацыя». Там пакідаем электронную пошту, нумар тэлефона, а для пацвярджэння рэгістрацыі пераходзім па спасылцы, дасланай вам у лісце, і ўводзім код, дасланы па смс.

Увага! Для дадання банкаўскай бескантактавай карткі або NFC-прылады (пры аплаце праезду з выкарыстаннем смартфона, смарт-гадзінніка і іншых) неабходна здзяйсненне хоць бы адной аперацыі па аплаце праезду.

Пасля гэтага перайдзіце ў раздзел «Дадаць» картку/NFC-прыладу і ўвядзіце 16 лічбаў «пластыка» або апошнія чатыры лічбы токена карты (для NFC-прылады). Характэрна, што для дадання NFC-прылады неабходна ўказаць прыкладны прамежак часу, у які з яе дапамогай праводзілася аплата праезду. У канцы працы з раздзелам націсніце «Дадаць».

І толькі пасля гэтай рэгістрацыі вы зможаце «адвязаць» сваю «электронку». Для гэтага трэба перайсці ў раздзел «Падрабязнасці» абраней карткі і націснуць «Выдаліць».

Цяпер у мяне ёсць візітоўніца, дзе побач з праязным ляжаць дзве «адвязаныя» бескантактавыя карткі, і я ўпэўнены, што пры аплаце спрацуе патрэбны мне «пластык».

### Аплата банкаўскім «пластыкам»: цяпер грошы спісваюцца раз на тры дні. Чаму?

Пры паспяховай аплаце банкаўскай карткай, напрыклад, у метро, праход праз турнікет будзе дазволены, і з рахунку вашай карткі на працягу 48 гадзін будзе аўтаматычна спісаны кошт паездкі. У выпадку некалькіх паспяховых аплат праезду, здзейсненых на працягу 48 гадзін, выкананыя аперацыі агрэгуюцца ў адну транзакцыю, але не больш чым тры паспяховыя аплаты праезду. Зыходзячы з дзеючага тарыфу за праезд у метро 70 капеек, сума адной транзакцыі не перавысіць 2 рублі 10 капеек.

Чаму транзакцыі аб'ядноўваюцца? Ёсць механізмы, якія дазваляюць кіраваць транзакцыйнай нагрузкай. Сістэма распрацоўваецца як масавая, і ў гадзіны пік гэтыя механізмы дазваляюць кіраваць нагрузкай, каб усе транзакцыі апрацоўваліся якасна. З іншага боку, банк праводзіць акцыі, і ўладальнікам пэўных карт часам дазваляецца праходзіць у метро бясплатна. Гэта значыць, працуе механізм зніжак.

### Банкаўскай карткай можна аплаціць за сябе і чатырох чалавек?

У Мінскім метрапалітэне колькасць пачарговых праходаў па адной і той жа банкаўскай бескантактавай картцы/NFC-прыладзе на адным і тым жа турнікеце ў межах лімітаванага прамежку часу не павінна перавышаць пяці. Спробу зрабіць больш за пяць аплат валідатар блакіруе. Наступныя аплаты аўтаматычна становяцца даступнымі праз 15 хвілін.

Паўторнае прыкладанне карткі для аплаты іншага пасажыра можа ажыццяўляцца толькі пасля праходу папярэдняга. На наземным транспарце, у тым ліку на гарадскіх лініях Беларускай чыгункі, па адной банкаўскай карце магчымая аплата зноў-такі за пяцярых пасажыраў. Пасля пяціразовай аплаты па адной банкаўскай карце яна блакіруецца для аплаты да канчатковага прыпынку маршруту.

# ЛЕПШ ПАРАЎНОЎВАЦЬ, ЧЫМ ПЕРАПЛАЧВАЦЬ

## Стартап InfoPrice запусціў параўнанне цэн на прадукты службаў дастаўкі

**Цяпер у гэтага бясплатнага сэрвісу з'явіўся раздзел, у якім можна параўнаць цэны на тавары ў службах дастаўкі. Калі падабраць набор прадуктаў, сістэма падкажа, дзе іх танней заказаць. Паводле ацэнак распрацоўшчыкаў, тым самым можна сэканоміць да чвэрці сумы на кожным чэку.**

Цяпер сэрвіс параўноўвае цэны на тавары трох службаў дастаўкі — «Хіт! Дастаўка», «Green дастаўка» і «Востраў чысціні», а неўзабаве да іх далучыцца «OZ.бай-бай». База даных уключае 44 тысячы пазіцый, што на 10 тысяч найменняў больш, чым па прадуктовых крамах. Новыя тавары і цэны з'яўляюцца штодня.

Цэны актуальныя для ўсіх гарадоў краіны. Але ёсць нюанс: яны павінны ўваходзіць у геаграфію дастаўкі той ці іншай сеткі. Прыцаніцца можна да асобных тавараў або іх набораў. Для гэтага трэба «скласці» патрэбныя прадукты ў «разумны» кошык, які пакажа, дзе больш выгадна зрабіць заказ. У каталогу — прадукты харчавання, прамтавары, сродкі гігіены, дзіцячыя цацкі і тавары для жывёл. На некаторыя пазіцыі цэны адрозніваюцца ў паўтара раза ў залежнасці ад дастаўшчыка.

Ідэя правільнага выбару прыйшла да распрацоўшчыкаў гэтага раздзелу яшчэ падчас пандэміі каранавіруса, тады людзі сталі больш актыўна карыстацца дастаўкай тавараў на дом. Дарэчы, гэтая звычка захавалася і пасля. Увесну і ўлетку рэзка вырас попыт на дастаўку прадуктаў, што падагравала і канкурэнцыю. Але цэны, як аказалася, ва ўсіх істотна адрозніваюцца. «Мы вырашылі дапамагчы спажыўцам не пераплачваць, тым больш што гэта не патрабуе ад іх намаганняў: выбар месца заказа — гэта пытанне некалькіх клікаў. У сярэднім можна сэканоміць 20—25 % ад сумы пакупкі», — адзначае кіраўнік праекта Раман Андрухаў.

Параўноўваць цэны можна як у браўзеры, так і ў мабільным дадатку з Google Play або AppStore. Пераключацца паміж версіямі InfoPrice з цэнамі магазінаў рознічнага гандлю і інтэрнэт-дастаўак можна з дапамогай тумблера ўверсе старонкі. Раней распрацоўшчыкі запусцілі бясплатны смарт-сканер. Калі навесці смартфон на штрых-код тавару, сэрвіс параўнае адпаведныя яму цэны ў розных крамах.

Маніторынгам цэн займаецца асобная каманда «таемных пакупнікоў». У дадзеным стартапе арганізатары сэрвісу займаюць незалежную пазіцыю да рытэйлераў, хоць апошнія могуць самастойна дзяліцца дадзенымі, каб кантраляваць іх актуальнасць.

# Бранзалет і «пластык» у адным флаконе

**Спецыяльна да пачатку навучальнага года, але да 1 кастрычніка, у адным з камерцыйных банкаў можна атрымаць плацежныя бранзалеты для дзяцей амаль па сабекошце.**
**Так, пры аднаразовай аплаце за ўвесь тэрмін дзеяння карткі, бранзалет каштуе 20 рублёў. Да бранзалета выпускаецца картка Visa Classic, у беларускіх рублях на два гады.**

Гэты плацежны гаджэт дазваляе аплачваць у адзін дотык любыя пакупкі ўсюды, дзе ёсць бескантактавы тэрмінал, напрыклад, у школьнай сталовай. Для разліку трэба паднесці яго да тэрмінала, пры куплі да 80 рублёў уводзіць PIN-код не трэба.




Што важна, няма абмежаванняў па ўзросце або колькасці бранзалетаў на аднаго чалавека. Калі дзіцяці ўжо споўнілася 14 гадоў, то рахунак можна адкрыць на яго імя, калі яно малодзейшае — на аднаго з бацькоў.

Напрыклад, у Пріорбанку прадстаўленыя бранзалеты чатырох колераў — чорнага, жоўтага, салатавага і бірузовага. Ён не баіцца вады, удараў і перападаў тэмператур. Плацежны бранзалет дапамагае дзіцяці хутка аплачваць пакупкі, а бацькам — лепш кантраляваць яго выдаткі. Паколькі ён заўсёды на руцэ, яго складана згубіць, у адрозненне ад наяўных або карты. Акрамя таго, дзеці адным і з першых асвойваюць новыя тэхналогіі — гэта дакладна.

**Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

# НАВАТ ЯГАДЫ Ў ШОКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Наша райспажыўтаварыства абслугоўвае Глускі і Асіповіцкі раёны, і ўсе нашы 70 крамаў займаюцца нарыхтоўкай вітамінай прадукцыі, — удакладняе **намеснік старшыні Глускай райспажыўкааперацыі Ганна ЯНУШЭЎСКАЯ.** — Прычым на тэрыторыі ўсёй Беларусі. За клубніцамі, напрыклад, ездзілі на Брэстчыну, у знакаміты на ўсю краіну Дварэц.

Нават каранавірус не паўплываў на пастаўкі ў Літву і Польшчу чарніц. Яны амаль цалкам пайшлі туды на экспарт. На гэтым тыдні ў Мурманск едуць апошнія тры тоны чарніц, плюс чорныя парэчкі.

Попыт на хутказамарожаныя ягады вялікі, не дзіўна, што цэх шокавай замарозкі працуе амаль бесперапынна.

— Нашы замарожаныя ягады ў вялікай колькасці ідуць у мінскія сеткавыя крамы і рэстараны, — адзначае **начальнік вытворчага цэха Вольга ГАЛІНСКАЯ.** — Шчыльна працуем са Смалявіцкім хлебазаводам, амаль усе ягады на іх тартах — нашы, у нас даўняе плённае супрацоўніцтва. Некаторыя беларускія вытворцы аддаюць перавагу польскім пастаўшчыкам, але наша ягада больш жывая. Магчыма, таварны выгляд яе не такі глянцавы, як у той, што вырашчана спецыяльна на плантацыях, але смак і пах ні ў якое параўнанне не ідуць. З намі таксама актыўна супрацоўнічаюць камбінаты школьнага харчавання. Зімой вітаміны для дзяцей гэта яшчэ і лякарства. Нашы замарожаныя ягады можна купіць і ў крамах іншых спажыўтаварыстваў. Цэхі шокавай замарозкі ў нашай сістэме ёсць толькі ў нас і ў Іванаве Брэсцкай вобласці.

Падчас майго візіту ў цэху шокавай замарозкі працавалі з шампіньёнамі. Садовыя ягады ўжо адышлі, лясныя толькі паспяваюць, а каб магутнасці былі загружаныя арганізацыя аказвае паслугі ўсім, хто да яе звяртаецца.

Надзяваем аднаразовыя халаты і рушым разам з Вольгай Алегаўнай у цэх.

— Вось гэты вялікі пакой, дзе падтрымліваецца вельмі нізкая плюсавая тэмпература блізкая да нуля, халадзільнік для сыравіны, — пачынае яна экскурсію.



Людміла МАКАРЭВІЧ з «Саветнікам» заўсёды на кантролі.

Назіраю, як шампіньёны мыюцца, рэжуцца спецыяльнымі прыстасаваннямі на лайсы і па канвееры падымаюцца ў вялікую маразільную скрыню. Самае цікавае адбываецца ўнутры гэтай таямнічай камеры. Вольга адкрывае дзверцы збоку і адтуль патыхае холадам. Тэмпература там каля мінус 40. Грыбы круцяцца ў зімовай віхуры і зноў знікаюць у цёмным тунэлі.

— Грыбы знізу абвяваюцца паветрам і, калі халодны паток паветра іх падкідвае, яны на ляту замарожваюцца, нават спужацца не паспяваюць, — жартуе мой гід. Яна б магла праводзіць экскурсіі і для аматараў вытворчага турызму.

У наступным памяшканні яшчэ халадней. Замарожаныя грыбы, якія з грукатам вылятаюць з тунэля, прымае жанчына ў цёплай куртцы і шапцы — бр-ррр, тут сапраўдная зіма. Калі наш клімат цалкам зменіцца на трапічны, сюды можна будзе пераносіць рэзідэнцыю Дзеда Мароза.

Гатовая прадукцыя вывозіцца ў камеры захавання. Іх тут пяць. Ідзём глядзець. Халадзільнікі — гэта асобныя пакоі, на сцяне датчыкі, якія ў аўтаматычным рэжыме паказваюць тэмпературу. Калі там мінус дзесяць, значыць ідзе працэс загрузкі, а вось там, дзе ён скончыўся, мароз ужо не меней за 20.

— Вельмі ўдалы быў сезон, — радуецца Вольга. — Усё, што маглі, рэалізавалі. Аператыўна спрацавалі з адгрузкай. Дапамагае і тое, што ў нас усё сваё — і абсталяванне для перапрацоўкі, і транспарт.

Самае важнае, кажа спецыяліст, аналіз рызыкі ў крытычных пунктах. Гэта тыя ўчасткі вытворчасці, дзе павінна быць павышаная ўвага да выканання ўсіх тэхналогій і нарматыўных дакументаў. А гэта перш за ўсё ўваходны кантроль.



— У нас вельмі сур'ёзны кантроль па фізіка-матэматычных паказчыках і асабліва, што датычыцца дзікарослых, па радыялогіі. У нас з гэтым вельмі строга. На якасць уплывае ўсё, у тым ліку чалавечы фактар, нават яго настрой, — пераканана суразмоўніца.

Дарэчы, наконт кантролю магу асабіста засведчыць — узбраенне сур'ёзнае. Радыёлаг Ганна Макарэвіч дэманструе радыяметр, у руках з якім яна вельмі нагадвае паляўнічага на прывіды. Дарэчы, таксама можна зарабляць на гарадскіх святах. Жартую, канешне. Але прыстасаванне сапраўды ўражвае. Не трэба доўга вымяраць, паднёс да скрыні з сыравінай і вынік вядомы.

— Уводзіцца аб'ём, націскаецца кнопка — і ўся справа, — кажа Ганна. — Усе ведаюць, што ў нас вельмі вялікія прэтэнзіі да якасці. Напачатку дзейнасці цэха па замарозцы быў выпадак, калі нашу машыну завярнулі на мяжы. Пасля таго мы зрабілі ўсё, каб такіх выпадкаў больш не было. За два гады маёй работы радыёлагам толькі адзін раз мы адмовіліся прыняць ягады. Іх прывезлі з Гомельскай вобласці, і яны былі «брудныя». У нас калі нават невялікае падазрэнне на радыяцыю ёсць, уся партыя бракуецца.

Апошнім часам усё больш стала паяўляцца прыватных вытворчасцяў па шокавай замарозцы. Нядаўна адкрыўся такі завод і ў Асіповіцкім раёне. І, каб канкурэнт не змог перашкодзіць бізнесу, даводзіцца шмат працаваць.

— Нашы людзі работы не баяцца, — аптымістычна кажа Вольга. — Гэта ж рэальны заробак. Ведаю па сабе: тыя, хто тут працуюць, лета не бачаць. Калі на вуліцы плюс 37 градусаў, ты стаіш тут у цёплай куртцы і табе не горача. Мы паміж сабой часам жартуем, што старасць да нас не дабярэцца. Як той казаў, мяса ў холадзе не псуецца. І на бальнічны з прастудай нашы работнікі амаль не ходзяць. Загартаваныя.

На нарыхтоўшчыках арганізацыя не эканоміць, яны ёсць як сезонныя, так і пастаянныя. Людміла Макарэвіч з ліку пастаянных. Зараз яна ўся ў справах, сезон яблыкаў у разгары. Увесь яе двор застаўлены мяхамі з ураджаем. Хоць, на яе думку, сёлета ён нашмат горшы, чым быў два гады таму. Тады яна здала ў разы болей. Людміла Уладзіміраўна нарыхтоўшчыца з дзесяцігадовым стажам. Прызнаецца, што шмат прыйшлося папрацаваць, каб набыць кліентуру. Затое цяпер, калі што трэба, бярэ тэлефон і аператыўна вырашае пытанне. Дарэчы, і гаспадыня яна выдатная. Для сябе нарыхтоўвае вітамінныя прысмакі дзясяткамі літраў. Смяецца, што зімой усё смачна. І гэта сапраўды так.



Вольга ГАЛІНСКАЯ праводзіць экскурсію.

**Старшыня Глускага райвыканкама Сцяпан ЧАЧУХА:**

— У нас жывуць вельмі працавітыя і старанныя людзі, якія сваёй добрасумленнай працай уносяць неацэнны ўклад у развіццё эканомікі і сацыяльнай сферы раёна. Таварыства «Глускі кошык» для раёна значны аб'ект, і ў яго яшчэ ёсць рэзервы, над якімі трэба працаваць. Сёння гэта неабходна рабіць з падвоенай сілай. Толькі старannай працай можна забяспечыць сабе эканамічную стабільнасць і незалежнасць, павысіць сваю канкурэнтаздольнасць і якасць выпускаемай прадукцыі. Пры гэтым неабходна больш эфектыўна выкарыстоўваць мясцовыя рэсурсы і кадравы патэнцыял.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара.**

*Глуск.*




# Майстэрства ў спадчыну

Хлебапёк — адна з прафесій, запатрабаваных грамадствам ва ўсе часы.

Сёння ў гэтай старажытнай справе дапамагаюць аўтаматыка і электроніка, але, як і ў мінулым, галоўнай умовай працоўнага поспеху застаецца ўласнае прафесійнае майстэрства.

**Паліна ТРЫБУХОЎСКАЯ** *(на здымку справа)* прыйшла працаваць на мінскі хлебазавод № 6 з дыпломам, які сведчыць, што маладая работніца дасканала валодае пяццю кваліфікацыямі. Ёй дару-чылі адказны працэс на ўчастку закваскі.

Інжынер-тэхнолаг **Алена ШКЕЛЬ** *(на здымку злева)* занятая на іншым участку вытворчасці, яна сочыць за якасцю сыравіны. Хлеб «Спадчына», які выпякаюць на прадпрыемстве, ахвотна набываюць у крамах сталіцы і навакольных гарадоў і вёсак.

**Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.**



## Класная навіна

# ПЕРШЫ Ў КРАІНЕ ПОМНІК БУЛЬБЕ З'ЯВІЦЦА Ў ШКОЛЕ

**У вучэбна-педагагічным комплексе «Дзешчанскі дзіцячы сад — сярэдняя школа» Уздзенскага раёна працуе адзіны ў краіне музей бульбы. А ў перспектыве тут з'явіцца і першы ў Беларусі помнік бульбе. Аказаць садзейнічанне гэтай справе паабяцаў кіраўнік цэнтральнага рэгіёна Аляксандр ТУРЧЫН падчас наведвання ўстановы адукацыі, паведамляе прэс-служба Мінаблвыканкама.**

— Гісторыя нашага музея пачалася дзесяць гадоў таму, — расказвае дырэктар Наталля Чаркас. — Мы доўга думалі, чаму б прысвяціць экспазіцыю. Да ідэі падштурхнуў той факт, што мясцовае сельгаспрадпрыемства — эксперыментальная база імя Суворава — займаецца вытворчасцю насеннага матэрыялу новых сартоў беларускай селекцыі гэтай культуры. А чаму б бульбе не быць галоўнай гераіняй нашага музея, вырашылі мы і пачалі актыўна збіраць экспанаты. Сёння іх налічваецца 140.

Падчас візіту Аляксандра Турчына ў музеі экскурсаводамі «працавалі» вучні 11 класа Ксенія Зуева і Крысціна Жалюк.

— Штогод у межах работы музея ў нас ладзяцца восеньскія кірмашы, бульба-фэсты і іншыя захапляльныя мерапрыемствы. А аднойчы ўсе класы атрымалі заданне вырабіць з разнастайных матэрыялаў помнік бульбе. Выйшлі дастаткова цікавыя варыянты, — падзяліліся дзяўчаты.

— А чаму б вам не правесці апытанне сярод вучняў, бацькоў, ды і ўсіх жыхароў аграгарадка. Разам і выбераце. А мясцовыя органы ўлады тады ўжо дапамогуць зрабіць помнік і ўладкаваць яго, — прапанаваў губернатар.

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Трест Белтрансстрой»** (УНП 100120922), 220030, г. Минск, ул. Советская, д. 8, тел. +375172251985, в лице антикризисного управляющего ООО «Юридическое антикризисное агентство «ВИТКОНСАЛТ».

Вторые повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **05 октября 2020 г. 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Предмет торгов, местонахождение | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 200/С-500014, площадь – 559,8 кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание конторы, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 240100000002000292 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 8-я Свердлова, 4 | 505 920,00 |
| 2 | ФОК общ. пл. 764,0 кв. м, капитальное строение, № 350/С-111202 (назначение – здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения), расположенное на земельном участке с кадастровым № 340100000005007703 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Никольская, 7 | 520 320,00 |
| 3 | Производственная база, расположенная по адресу: г. Барановичи, ул. Минский парк, д. 10Б | 1 227 744,96 |
Ніна Мікалаеўна старастам у Дзівіне не так і даўно — паўтара года. Як выходзіла на пенсію, 33 гады адпрацаваўшы спецыялістам у сельвыканкаме, старшыня Вера Пікула папрасіла ўзяць на сябе гэты ўчастак работы. Ніна Мікалаеўна не спяшалася згаджацца, думала пажыць жыццём звычайнай вясковай пенсіянеркі, каб агарод і паездкі ў грыбы, каб у асалоду паглядзець тэлеперадачу і пачытаць добрую кнігу няспешна, пагасціць у сваякоў, выбрацца ў горад па магазінах. Справу для сябе заўсёды знайсці можна, было б жаданне. Але старшыня праяўляла настойлівасць, тады ў патэнцыяльнай старасты паявіўся контраргумент: невядома, як людзі ўспрымуць яе кандыдатуру, у сельсавеце столькі гадоў прабыла, можа, і не ўсім падабалася.

Ну і вынеслі пытанне на сход, а людзі ўзялі і падтрымалі Ніну Клачковіч фактычна аднадушна. Што ўжо тут рабіць, застаецца працаваць. Тым больш што Дзівін — вялікі населены пункт, а яна не толькі па рабоце ведае тутэйшых людзей, нарадзілася і вырасла тут, знае амаль кожнага жыхара, і бацькоў яго, і дзяцей...

Самай першай яе справай на пасту старасты было добраўпарадкаванне могілак. Разам з актывісткамі ўсіх абыходзілі, размаўлялі, грошы збіралі, потым машыны і арганізацыі наймалі, суботнікі арганізоўвалі. На адным баку паставілі агароджу даўжынёй 400 метраў, на другім каля 80 метраў. Замовілі вароты, хутка будуць гатовыя. Гэта толькі сказаць ці напісаць пра вынік проста: памесцяцца ў два радкі, а зрабіць надзвычай складана.

— Колькі намаганняў спатрэбілася, каб спілаваць дрэвы, выдаліць пні, расчысціць пляцоўку, — пералічвае Ніна Клачковіч. — Нават калі прыйдуць машыны ЖКГ, лясніцтва ці іншай службы, спецыялісты знясуць дрэва, забяруць камлі на шчэпкі, і паедуць. А колькі смецця, галін, адходаў застаецца! Усё трэба выграбці, вымесці і вынесці. І гэта ўжо наша, найбольш, жаночая работа. Выходзілі на суботнікі, працавалі ў іншыя дні. Многія людзі адгукаюцца, разумеюць, дапамагаюць, а іншы скажа, нібы адрэжа: «Я заняты», і ўсё, размова на гэтым заканчваецца. Часам даводзілася чуць, маўляў, мае магілы дагледжаны, а да



Стараста Ніна КЛАЧКОВІЧ.

іншых мне справы няма, — прыцягвае стараста. — Але ж на нашых могілках ёсць шмат магіл, за якімі няма каму дагледзець, на якіх нават крыжы паваліліся. І гэта рабіць, лічу, абавязак усёй грамады. Так мы і рабілі з многімі і многімі жыхарамі вёскі.

Ну а перад дажынкамі, на думку Ніны Клачковіч, папрацавалі добра. На работу па афарбоўцы агароджы, фасадаў, камунальных пабудоў выходзілі работнікі выканкама, устаноў адукацыі і культуры, сацыяльныя работнікі. Адной чы такая восень калега па працоўным дэсанце насмяшыла Ніну Мікалаеўну. Жанчына думала, што стараста за сваю работу атрымлівае штомесячнае грашовае ўзнагароджанне, як і любы работнік. Давялося растлумачыць, што тых грошай, якія раз у квартал выплачваюць у якасці заахвочвання старастам, хапае акурат на тэлефонныя перагаворы з жыхарамі і актывістамі. І то не заўсёды, у перыяд актыўных суботнікаў гэтай вясной не хапала.

Суботнікі па навядзенні парадку прайшлі, наперадзе — новыя справы. Зноў вяртаецца стараста да мінулых дажынак: «Такога свята дакладна не ведаў Дзівін. Прыемна было ўбачыць людзей, што гадамі альбо дзесяцігоддзямі тут не бывалі. На святе заўважыла жанчыну, яна жыве ў Мінску, бацькі паўміралі даўным-даўно, сваякоў паблізу няма, але вось прыехала, пацягнула, значыць, у родныя мясціны. Такіх гасцей было многа.

І як добра, што мы паказалі сябе найлепшым чынам. Вакол чысціня, прыгажосць, мноства кветак. Дарэчы, пра кветкі. На падтрыманне выгляду клумбаў спатрэбяцца грошы і пастаянны работнік. Спадзяёмся, што за гэта возьмецца ўчастак ЖКГ. Вельмі хацелася б, каб клумбы і далей радавалі вока. І ўсім нам трэба мець на ўвазе, што знешні выгляд залежыць ад кожнага. Гаспадыні ведаюць, калі перад Вялікаднем ладзіш вялікую ўборку, здаецца, зрабіў усё, з кожнага куточка пыл ды бруд прыбраў. А пройдзе два-тры тыдні, і зноў недзе нешта вылазіць, трэба падчышчаць і падпраўляць. Вось так і падтрымліваецца парадак і ў доме, і ў населеным пункце», — разважае стараста.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Кобрынскі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 17 верасня 2020 года.

Памяць

# НА ТРЭЦІ ДЗЕНЬ ВАЙНЫ

## З балота пад Івацэвічамі ўзнялі рэшткі бамбардзіроўшчыка і астанкі лётчыкаў

**У балоцістай мясцовасці на поўдні Івацэвіцкага раёна, што на Брэстчыне, за апошняе дзесяцігоддзе не раз знаходзілі рэшткі самалётаў, збітых у баях Вялікай Айчыннай вайны. Амаль кожны раз актывістам пошуку дапамагалі сведчанні мясцовых старажылаў. Некаторыя з дзяцінства памяталі жахлівыя падрабязнасці, іншым месца падзення паказвалі бацькі. Тут ішлі жорсткія баі, асабліва ў першыя дні вайны. Шмат савецкіх лётчыкаў засталіся ў вільготнай пашчы балота.**



Вось і нядаўна, у верасні, удалося ўзняць рэшткі яшчэ аднаго самалёта і даведацца аб яго экіпажы. Гэты самалёт, савецкі дальні бамбардзіроўшчык ДБ-3Ф, удзельнікі гісторыка-патрыятычна-тэхнічнага атрада «Авіяпошук-Брэст» шукалі доўгія восем гадоў. У іх была інфармацыя, што ў пойме ракі Грыўды ў 1941 годзе ўпаў самалёт. Энтузіястам пошуку гісторыю гібелі машыны расказаў жыхар вёскі Плехава Аляксандр Брыль. Праўда, Аляксандру Андрэевічу тады было ўсяго чатыры гады. Але ад бацькі ён ведаў, што самалёт падаў, пралятаючы літаральна над хатай. Яшчэ бацька ўспамінаў, што, паводле яго назіранняў, лётчыкі спрабавалі дапамагчы агнём байцам нейкага падраздзялення, каб тыя маглі выйсці з акружэння, але машына была збітая.

Аднаго з тых лётчыкаў вясковцы знайшлі і адразу пахавалі. А вось рэшткі машыны яшчэ тырчэлі з балота і ў 50-х, і ў 60-х гадах. Менавіта 83-гадовы Аляксандр Брыль урэшце стаў правадніком атрада на цяперашнім этапе пошукаў. Варта сказаць, што за восем гадоў раён пошукаў звузіўся. Байцы атрада праверылі мясцовасць металадэтэктарамі. І да пачатку верасня ўжо амаль дакладна ведалі месца знаходжання бамбардзіроўшчыка. Вядома, без тэхнікі падняць з зямлі тое, што засталося ад машыны, было б немагчыма. Таму па дапамогу звярнуліся ў Івацэвіцкае прадпрыемства меліярацыйных сістэм. Магутны гусенічны экскаватар падняў фрагменты самалёта. Удалося дастаць з зямлі рухавікі з нумарамі, па якіх аказалася нескладана высветліць нумар часці самалёта і членаў экіпажа.

Кіраўнік атрада «Авіяпошук-Брэст» Уладзімір Бухта звязаўся з расійскімі калегамі з атрада «Вымпел». Літаральна за некалькі хвілін з дапамогай Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі яны даведаліся, што знойдзены двухматорны самалёт быў прыпісаны да 212-га дальняга бамбардзіровачнага авіяцыйнага палка. Яго экіпаж не вярнуўся з выканання баявога задання 24 чэрвеня 1941 года.

На трэці дзень вайны тут, пад Івацэвічамі, загінулі камандзір звяна Іван Даўгаленка, штурман — старшы лейтэнант Васіль Савянкоў, стралок-радыст сяржант Святаслаў Сінельнікаў. Даўгаленка лічыцца пахаваным у брацкай магіле на станцыі Даманава, гэта яго цела знайшлі і пахавалі мясцовыя жыхары. Двое ж астатніх членаў экіпажа па дакументах праходзяць як зніклыя без вестак. Вельмі высокая верагоднасць, што іх косныя астанкі пошукавікі знайшлі сярод абломкаў самалёта. Далейшую работу, як і патрабуе заканадаўства, зробяць спецыялісты 52-га спецыялізаванага пошукавага батальёна Міністэрства абароны Беларусі.



...У архівах знайшліся здымкі членаў экіпажа. Яны, такія маладыя і прыгожыя, не паспелі павяваць і загінулі. Аж да гэтай пары яны лічыліся тымі, хто не вярнуўся з баявога задання. У вайну і адразу пасля яе гэта было як кляймо, бо такія людзі заўсёды былі пад падазрэннем. «А вось цяпер праз 79 гадоў мы вярнулі ім, іх нашчадкам добрае імя. Цяпер іх праўнукі могуць з гонарам сказаць, што прадзед герaічна загінуў у баях за Радзіму», — гаворыць Уладзімір Бухта. Уладзімір мае намер стварыць музей узнятых самалётаў. Фрагменты тэхнікі захоўваюцца ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой».

Гісторыка-патрыятычна-тэхнічны атрад «Авіяпошук-Брэст» за гады існавання ўстанавіў месцы падзення дзясяткаў самалётаў, вярнуў з небыцця імёны больш чым 20 лётчыкаў, якія былі ў спісах тых, хто прапаў без вестак. Вось толькі летась у Целяханах Івацэвіцкага раёна 22 чэрвеня з вайсковай пашанай перапахавалі астанкі стралка-радыста Іл-4 Карпа Ваўка, ураджэнца Палтаўскай вобласці. Яго знайшоў названы атрад. А літаральна праз два месяцы тут жа хавалі яшчэ аднаго знойдзенага атрадам лётчыка Голікава з Падмаскоўя. Гэта стала вынікам яшчэ адной паспяховай пошукавай аперацыі, тады зноў з балота ўзнялі самалёт. Цяпер вось — гэты бамбардзіроўшчык. Пошукі працягваюцца. Як вядома, вайна не лічыцца скончанай, пакуль не будзе пахаваны апошні салдат. Многія з іх яшчэ чакаюць вяртання сваіх добрых імёнаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

---

«Каласавіны-2020»

## Новыя даследаванні літаратурнай памяці

**2-3 кастрычніка 2020 года ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа пройдзе XXXIV навукова-практычная канферэнцыя «Каласавіны-2020».**

Унікальны, шырокамаштабны праект з багатай гісторыяй, нягледзячы ні на якія эпідэміялагічныя перашкоды, ізноў збірае сяброў Коласаўскага музея, коласазнаўцаў, калег-музейшчыкаў і архівістаў, спецыялістаў у галіне гісторыі беларускай літаратуры. Спярша — 2 кастрычніка — у музеі ў Мінску па вуліцы Акадэмічнай, 5 пройдзе літаратуразнаўчая секцыя «Коласазнаўства ў XXI стагоддзі: вынікі і перспектывы». Таксама 2 кастрычніка адбудзецца пасяджэнне гісторыка-краязнаўчай секцыі «Захаванне, музеефікацыя і ўстойлівае развіццё помнікаў драўлянага дойлідства», але ўжо ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — па вуліцы Акадэмічнай, 1.

А 3 кастрычніка для выступленняў, дыскусій і правядзення круглага стала ўдзельнікі збяруцца ў філіяле «Мікалаеўшчына» Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа ў Стоўбцах па вуліцы Сянкевіча, 6. У праграме «Каласавін-2020» і экскурсія на аб'ектах філіяла «Мікалаеўшчына».

**Сяргей ШЫЧКО.**

Арыенцір часу

# КАБ СЛОВУ ПАСПРЫЯЦЬ

**Часопісы сёння не могуць існаваць толькі ў друкаваным выглядзе — трэба заваёўваць інтэрнэт-прастору. Такую думку выказаў намеснік дырэктара выдавецкага дома «Звязда», галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва» Аляксей ЧАРОТА.**

— Літаратурная і інфармацыйная прасторы зараз перанасычаны творамі самых розных жанраў, і кожны, хто мае грошы і жаданне, можа выдаць кнігу як у папяровым выглядзе, так і ў электронным. Аднак, разам з тым, тыражы часопісаў штогод падаюць, цікавасць да сур'ёзнай літаратуры таксама зніжаецца. Непадрыхтаваны чытач не мае арыенціру, што такое якасная літаратура і чым яна адрозніваецца ад масавай, нізкаякаснай. Такая сітуацыя назіраецца не толькі ў нашай краіне, але і ў іншых. Аднак, вывучаючы замежную практыку, прыходзіш да пераканання, што друкаваныя часопісы і кнігі ўсё ж такі застануцца, будуць прыкметай адукаванасці чалавека.

Аляксей Чарота заўважыў, што задача літаратурных часопісаў — быць арыенцірам, эталонам добрага густу.

— Гэта адбываецца дзякуючы рабоце рэдактараў, якія маюць адпаведную адукацыю і навыкі, — яны могуць вылучыць найлепшае, што ёсць на цяперашні момант. Неабходна, каб існавала як мага больш выданняў з рознымі пунктамі гледжання, што дазволіць мець шырокае разуменне тых працэсаў, якія адбываюцца сёння ў літаратуры.

«Па-ранейшаму для часопіса застаюцца важныя два вектары развіцця: гэта фіксацыя сучаснага літаратурнага працэсу і захаванне гістарычнай памяці», — упэўнена **галоўны рэдактар «Полымя» Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ.**

— Да першай катэгорыі адносяцца празаічныя творы, сёлета, напрыклад, у часопісе будзе надрукавана шостая частка прыгодніцкага рамана Людмілы Рублеўскай «Авантуры Пранціша Вырвіча», таксама хутка выйдзе раман Міколы Адама «Адаптацыя». Ужо быў надрукаваны раман Уладзіміра Гніламёдава «Праўда жыве пасярэдзіне». Акцэнт робім і на перакладах сучасных твораў з розных краін. Напрыклад, на старонках часопіса можна ўбачыць «Ліст да Еўропы» шведскай пісьменніцы Атэны Фарухсад у перакладзе Алены Казловай, апавяданні польскага пісьменніка Анджэя Стасюка ў перакладзе Марыі Мартысевіч. У далейшым будзе перакладзены на беларускую мову і выпушчаны гістарычны паэтычны зборнік «Старэйшая Эда» ў перакладзе Яўгена Папакуля. Сёлета чытачам таксама будзе прадстаўлена серыя вокладак Мірaслава Шымбая «Помнікі». Да таго ж, будзем адзначаць дзве значныя падзеі — юбілеі пісьменнікаў Уладзіміра Караткевіча і Андрэя Макаёнка. Гэта будзе адлюстравана і ў наступных нумарах часопіса. Сумесна з Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва рыхтуем публікацыю, прысвечаную Андрэю Макаёнку, і прэзентуем кнігу Яўгена Гарадніцкага, якая прысвечана Уладзіміру Караткевічу. Нечаканы ракурс захавання гістарычнай памяці праглядаецца і ў тэкстах аўтараў, — можна выдзеліць успаміны дачок пісьменнікаў Івана Мележа і Івана Навуменкі Людмілы Мележ і Людмілы Навуменкі.

«Сёння ўжо нікога не здзівіць тым, што часопіс выходзіць не толькі на паперы, кожны яго нумар можна выпісаць і прачытаць у PDF-фармаце. Таму распрацоўваем актуальныя навінкі і выкарыстоўваем новыя метады, каб ахопліваць аўдыторыю як аўтараў, так і чытачоў рознага ўзросту», — аб гэтым расказала **галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» Святлана ВОЦІНАВА.**

— Наша апошняе нoваўвядзенне — гэта інтэрактыўны змест часопіса, — каля 25—35 працэнтаў нумара пазначаны менавіта такім чынам. Таксама актыўна выкарыстоўваем QR-коды. Акрамя таго, кожны нумар часопіса суправаджаецца прэзентацыйным ролікам, а на сайце ёсць спасылка на наш YouTube-канал «Маладосць-ТВ». Ёсць асобны блок «Пераклады», дзе амаль заўсёды прадстаўлены работы студэнтаў Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Да нас яны прыходзяць на практыку і перакладаюць выданні з самых розных моў. Сёлета да нас далучыліся маладыя людзі з розных факультэтаў БДУ.

«Каб літаратурныя часопісы актыўна развіваліся, трэба, безумоўна, крочыць у нагу з часам і разам з тым не адыходзіць ад традыцый», — лічыць **галоўны рэдактар часопіса «Нёман» Юлія АЛЕЙЧАНКА.**

— На нашых старонках заўсёды з'яўляюцца крытычныя рэцэнзіі, актуальныя публікацыі пра сучасную літаратуру, літаратурныя працэсы, культурныя падзеі, матэрыялы пра тэатр, музыку, жывапіс, ёсць асобны блок публіцыстыкі. Раней на вокладках нумароў часопіса былі прадстаўлены вывы беларускіх пісьменнікаў, сёлета мы вырашылі звярнуць увагу на сучаснае актуальнае мастацтва — муралы. Калі казаць пра напаўненне, мы змяшчаем шмат перакладаў вершаў беларускіх аўтараў на рускую мову: Васіля Зуёнка, Мар'яна Дуксы, Галіны Дубянецкай, Віктара Гардзея, Міхася Башлакова, Міколы Мятліцкага і іншых. Будуць апублікаваны пераклады Анатоля Вярцінскага, Казіміра Камейшы. Беларуская проза прадстаўлена перакладамі Людмілы Рублеўскай, Андрэя Федарэнкі, Віктара Шніпа. Актыўна развіваем рускамоўную літаратуру, прадстаўляем чытачам ужо такіх вядомых аўтараў, як Алег Ждан, Алена Папова, Фёдар Конеў, Марына Лайкова, Вера Зелянко. Акрамя таго, значную ўвагу аддаём літаратурным дэбютам.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 430/С-57182 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – здание кафе «Неман»), общей площадью 566,4 кв. м, расположенное по адресу: Новогрудский р-н, г. п. Любча, ул. Советская, 6

Лот № 1 находится на земельном участке, кадастровый № 424355700001000539, площадью 0,1997 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания кафе «Неман»), расположенном по адресу: Новогрудский р-н, г. п. Любча, ул. Советская, 6

Начальная цена продажи – 1 714,11 руб. (одна тысяча семьсот четырнадцать рублей одиннадцать копеек) с учетом НДС

Сумма задатка – 171 руб. (сто семьдесят один рубль)

ЛОТ 2: капитальное строение, инв. № 430/С-57062 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание конторы), общей площадью 769,5 кв. м, расположенное по адресу: Новогрудский р-н, г. п. Любча, ул. Советская, 25

Лот № 2 находится на земельном участке, кадастровый № 424385990401000744, площадью 0,2684 га (назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений административного назначения), расположенном по адресу: Новогрудский р-н, г. п. Любча, ул. Советская, 25. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0085 га; земли, находящиеся на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема), код 2.4, площадью 0,2684 га

Начальная цена продажи – 1 438,68 руб. (одна тысяча четыреста тридцать восемь рублей шестьдесят восемь копеек) с учетом НДС

Сумма задатка – 143 руб. (сто сорок три рубля)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

**Продавец – Новогрудский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231400, г. Новогрудок, ул. Гродненская, 103, тел. 8-01597-239-52**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 02 октября 2020 г. в 14.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 19.06.2019 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 30 сентября 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion/**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении электронных торгов по продаже

# пансионата «Салтыковка»,

## принадлежащего ОАО «Нафтан»

**Лот №100920001, состав**: 1. Одноэтажное здание, площадь 210,7 кв. м, кадастровый № 50:15:0000000:83897. 2. Трехэтажное здание, площадь 2156,7 кв. м, кадастровый № 50:15:0000000:83903. 3. Котельная, площадь 36,6 кв. м, кадастровый № 50:15:0030107:48. 4. Здание обслуживающего персонала, площадь 62,1 кв. м, кадастровый № 50:15:0000000:83894. 5. Скважина, кадастровый № 50:15:0000000:83912. 6. Земельный участок, площадь 9 048,0 кв. м, кадастровый № 50:15:0030107:2. 7. Земельный участок, площадь 718,0 кв. м, кадастровый № 50:15:0030107:3. 8. Забор с воротами, литера 1-6. 9. Навес, литера Г, Г5. 10. Замощение, литера I-II. 11. Навес, литера Г2. 12. Беседка, литера Г3. 13. Бассейн, литера Г4. 14. Движимое имущество (оборудование, мебель, хозяйственный инвентарь и т. д.), в том числе: основные средства в количестве 101 единицы, отдельные предметы в составе оборотных средств в количестве 1228 единиц.

**Адрес**: Российская Федерация, Московская область, Балашихинский район, город Балашиха, микрорайон Салтыковка, ул. Профсоюзная, 12.

**Начальная цена (без учета НДС)** – 176 546 882,54 рос. руб.
**Задаток** – 20 000 000,00 рос. руб. **Шаг электронных торгов** – 5 %.
**Размер штрафа** – 20 000 000,00 рос. руб.
**Обременение.** Договор безвозмездного пользования имуществом

**Электронные торги состоятся 28.10.2020 в 11.00**
**(по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»)**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом ЭТП «ТОРГИБЕЛ». Детальная информация о порядке участия в электронных торгах, условиях участия, сроке подписания договора купли-продажи, условиях оплаты размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (http://торги.бел).

**Продавец:** ОАО «Нафтан», 211441, Республика Беларусь, Витебская обл., г. Новополоцк. **Организатор электронных торгов и Оператор электронной торговой площадки:** РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9.

Задаток для резидентов РБ перечисляется
на р/с BY68BPSB30121543370789330000 в ОАО «БПС-Сбербанк»,
BIC банка BPSBBY2X, г. Минск.
Задаток для нерезидентов РБ перечисляется
на р/с BY66BPSB30121543370496430000 ОАО «БПС-Сбербанк»
BIC банка BPSBBY2X счет 30111810100000000090
ПАО «Сбербанк» БИК 044525225, ИНН 7707083893,
SWIFT код – SABRRUMM к/с 30101810400000000225
в ГУ Банка России по ЦФО, SWIFT SABRRUM.

**Получатель** – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
**Назначение платежа:** задаток для участия в электронных торгах 28.10.2020 (Лот № 100920001).
**Срок внесения задатка:** в рос. руб. – по 22.10.2020; в бел. руб. – по 27.10.2020 до 11.00.
Аккредитация, регистрация и участие в электронных торгах осуществляются на ЭТП «ТОРГИБЕЛ». Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами: 27.10.2020 в 12.00.
Организация и проведение электронных торгов осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь, оформление и регистрация сделки в соответствии с законодательством Российской Федерации.

**☎ Организатор электронных торгов:**
**+ 7(920) 317-21-92, +7(495) 108-50-61, +375(17) 324-70-57,**
**+375(29) 550-09-52, +375(29) 356-90-03**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **Несвижское райпо, Минская обл., Несвижский р-н, г. Несвиж, ул. Советская, 5/1** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов:**
**недвижимое имущество (складская база),**
**расположенное по адресу: Минская обл., Несвижский р-н,**
**г. п. Городея, ул. Вокзальная, 2А, 2А/1, 2А/2, 2А/3, 2А/4,**
**реализуется одним лотом в следующем составе:**

| Наименование (назначение) | Общ. площадь | Инв. № |
|---|---|---|
| **Здание проходной** (здание неустановленного назначения). Составные части и принадлежности: целое одноэтажное кирпичное здание проходной 1А1/к | 12,5 кв. м | 621/С-1027507 |
| **Здание склада** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ). Составные части и принадлежности: целое одноэтажное кирпичное здание склада А1/к с навесом № 1 | 501,8 кв. м | 621/С-1027508 |
| **Здание склада** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ). Составные части и принадлежности: целое одноэтажное бревенчатое здание склада А1/д с подвалом (А1/д), двумя входами в подвал № 1, № 2, навесом № 3 | 981,1 кв. м | 621/С-1027512 |
| **Здание склада** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ). Составные части и принадлежности: целое одноэтажное металлическое здание склада 3А1/м | 190,5 кв. м | 621/С-1027513 |
| **Здание бытовое** (здание неустановленного назначения). Составные части и принадлежности: целое одноэтажное кирпичное здание бытовое 2А1/к с пристройкой № 1 | 31,5 кв. м | 621/С-1027510 |

**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве аренды по 23.02.2065 г. для обслуживания здания бытового, здания проходной и зданий складов, общ. пл. 0,4317 га

**Начальная цена (с НДС 20 %) – 106 146,88 белорусского рубля**

**Ограничения/обременения:** здания складов с инв. номерами 621/С-1027512, 621/С-1027508 находятся в частичной аренде. Подробнее на сайте www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** (десять) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить Организатору торгов вознаграждение в размере 3 (трех) процентов от цены продажи предметов аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 21.08.2020 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**
Начало торгов: **12.00 29.09.2020.**
Окончание торгов: **13.00 29.09.2020.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по 28.09.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Пуховичского районного потребительского общества (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:

<u>Лот № 1</u>: **магазин № 22** *(составные части и принадлежности: склад, тамбур, сарай)* **с инв. № 602/С-22083, общей площадью 99,7 кв. м, расположенный на земельном участке площадью 0,0600 га (право аренды по 26.05.2065) с кадастровым номером 624484802001000036 по адресу: Минская область, Пуховичский район, Пережирский с/с, д. Едлино, ул. Раздольная, 26.**

Начальная цена с НДС – **12 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **1 200,00** бел. руб.). *Цена снижена на 50 %.*

<u>Лот № 2</u>: **магазин** *(составные части и принадлежности: пристройка, сарай)* **с инв. № 602/С-54171, общей площадью 86,4 кв. м, расположенный на земельном участке площадью 0,1000 га (право аренды по 13.10.2065) с кадастровым номером 624487006601000127 по адресу: Минская область, Пуховичский район, Дубровский с/с, д. Синча, ул. Центральная, 50Б.** *Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: охранная зона линий электропередачи до 1000 В, площадь – 0,0046 га.*

Начальная цена с НДС – **8 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **800,00** бел. руб.). *Цена снижена на 50 %.*

<u>Лот № 3</u>: **магазин** *(составные части и принадлежности: склад)* **с инв. № 602/С-13794, общей площадью 78,4 кв. м, расположенный на земельном участке площадью 0,0245 га (право постоянного пользования) с кадастровым номером 624487909601000148 по адресу: Минская область, Пуховичский район, Туринский с/с, д. Уголец.** *Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: водоохранная зона реки Волма, площадь – 0,0245 га.*

Начальная цена с НДС – **9 500,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **950,00** бел. руб.). *Цена снижена на 50 %.*

**Объекты находятся под запретом совершения регистрационных действий. Судебных споров по ним не имеется. Запрет будет снят после произведения оплаты на депозитный счет главного управления юстиции Миноблисполкома.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. <u>Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 10 (десяти) процентов от цены продажи лота.</u> Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 09.06.2020. Аукцион состоится **29.09.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.09.2020** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.**

УНН 600115965

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Трест Белтрансстрой»** (УНП 100120922), 220030, г. Минск, ул. Советская, д. 8, тел. +375172251985, в лице антикризисного управляющего ООО «Юридическое антикризисное агентство «ВИТКОНСАЛТ».

Публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **19 октября 2020 г. 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Бульдозер ДЗ-110А, инв. № 331, г. в. 1988, зав. № 40346 | 2 520,00 |
| 2 | Легковой седан ГАЗ 31105, инв. № 70, г. в. 2006, кузов № X9631105061345954 | 636,00 |
| 3 | Легковой седан GAZ-3102, инв. № 123, г. в. 2007, кузов № X9631020071402126 | 792,00 |
| 4 | Погрузчик фронтальный ТО-18А, инв. № 380, г. в. 1989, зав. № 2922 | 8 520,00 |
| 5 | Экскаватор-погрузчик «Амкодор» 702ЕМ, инв. № 102, г. в., зав. № 0105 | 4 800,00 |
| 6 | Грузовой фургон ZIL-131, инв. № 94, г. в. 1982, зав. № 48944 | 3 120,00 |
| 7 | Грузовой специальный фургон вахтовый GAZ-3507 МВР-1, инв. № 226, г. в. 1991, рама № XTH330700M1466148 | 2 520,00 |
| 8 | Грузовой специальный самосвал MAZ 551605-271, инв. № 120004, г. в. 2007, рама № X3M55160570013630 | 1 800,00 |
| 9 | Электростанция передвижная дизельная силовая ЭСД-30 ВСТ-400, инв. № 264 | 1 560,00 |
| 10 | Электростанция силовая ЭСД-10, инв. № 20 | 1 188,00 |
| 11 | Рессивер РВ 900.10, инв. № 243 | 816,00 |
| 12 | Станок сверлильный 2С-132, инв. № 727 | 2 400,00 |
| 13 | Компрессор ПКСД 5.25, инв. № 186 | 1 920,00 |
| 14 | Рама лесопильная вертикальная одноэтажная Р-63-4А, инв. № 1174 | 1 320,00 |

**Местонахождение – г. Витебск, ул. Ковровая, 4.**
**Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.**

**Для участия в торгах необходимо в срок** <u>с 19.09.2020 г. 09.00 по 16.10.2020 г. 17.00:</u> 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Солигорский райагросервис» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

<u>Лот № 1:</u> **зерноуборочный комбайн «ДОН – 1500Б», 2004 года выпуска, гос. номер 3294 ОМ-5, заводской номер 088404, инвентарный номер 650, двигатель – ЯМЗ-238, номер 40217761, изготовитель – Российская Федерация.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **7 942,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **794,00** бел. руб.).

<u>Лот № 2:</u> **зерноуборочный комбайн «ДОН – 1500Б», 2005 года выпуска, гос. номер 4212 ОК-5, заводской номер 0911737, инвентарный номер 1399, двигатель – ЯМЗ-238, номер 50252678, изготовитель – Российская Федерация.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **11 933,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **1 193,30** бел. руб.).

<u>Лот № 3:</u> **картофелеуборочный комбайн ПКК-2-02 «Палессе РТ 22», 2008 года выпуска, цвет – красный, заводской номер 00501, инвентарный номер 4137, изготовитель – Республика Беларусь.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **26 676,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **2 667,60** бел. руб.).

<u>Лот № 4:</u> **картофелеуборочный комбайн WM Kartoffeltechnik 6500, 2010 года выпуска, заводской номер 85 03 03, инвентарный номер 47171, изготовитель – Германия.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **56 544,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **5 654,40** бел. руб.).

**Имущество расположено по адресу: Минская область, Солигорский район, г. п. Красная Слобода, ул. Советская, 45.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. <u>Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.</u> Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **19.10.2020** в **15.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.10.2020** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11.**

УНП 600072706

**Закрытое акционерное общество «ЮНИМИТ»**
(222220, Республика Беларусь, Минская обл., Смолевичский район, Плисский сельсовет, 9/12 в районе поселка Октябрьский)
сообщает, что директором ЗАО «ЮНИМИТ» 15.09.2020
принято решение о формировании реестра владельцев ценных бумаг.
Формирование реестра акционеров осуществляется
на 15.09.2020.

УНП 690660279

Простая мова

# «ХАЧУ НА МОРА ГЭТЫМ ЛЕТАМ»

## У нас завядзёнка такая — кожнае лета хацець на мора

**...А ў той год дык атрымалася нават пабываць — на Чорным.**
**Што казаць — адвялі душу: пакупаліся ў чыстай пяшчотнай вадзе, пагрэліся пад ласкавым паўднёвым сонейкам, накаштаваліся рознай смакаты і ўбачылі столькі прыгажосці...**
**— Ведаеш, аб чым я мару? — у апошні дзень спытала сяброўка.**
**— ?**
**— Прывезці сюды сваю маму. Ну хоць на тыдзень... Хоць раз у яе жыцці...**
**Мары, як вядома, збываюцца і не збываюцца. На вось гэту — спярша не хапала грошай, а потым...**
**Потым мама перанесла інсульт.**
**...Гэта — жарт: «Хачу на мора гэтым летам. У нас завядзёнка такая — кожнае лета хацець на мора».**



### Інструктаж

Вечар. Тралейбус. Голас: маладзіца, што сядзіць паблізу, гаворыць па мабільным — падобна, з мужам і досыць даўно. Тут і зараз самае слушнае:

— Ты ж бацькоў на вакзале сустрэнеш?.. Глядзі ж, хаця не спазніся... Лепш загадзя прыедзь... І сумкі ў яе забяры, бо я цябе ведаю — можаш забыцца... І не маўчы, як пень: параспытвай, як здароўе, што новага? А дома — пачастуй, з віном... Я ўсё падрыхтавала.

Заключная фраза: «Можа, яны грошай дадуць?»

(Анекдот — замест каментарыя: «Майго заробку мне хопіць да канца жыцця, калі я памру сёння ў 15 гадзін»).

### Хоць стой, хоць падай

«Мы любім бываць у Надзі», — казалі ў рэкламе кавы. Казалі даўно — мы, напэўна, забыліся б, калі б сапраўды не любілі — бываць... Яшчэ і таму, што Надзіны дзеці вучаць беларускую.

— Разувацца не трэба, — аднекуль з кухні загадвае васьмікласніца-дачка. — Праходзьце ў залу, сядайце на дыван.

— ?!

(Гэта, згадзіцеся, неяк нечаканенька, але ж...)

— Добраму чалавечку добра і ў запечку, — гукаем у адказ. — На дыван дык на дыван: пакуль мэблі не было, мы таксама на падлозе сядзелі.

— Прычым тут яна? — уляцеўшы ў вітальню, акругляе вочы дзяўчынка.

— А дыван ён што — на сцэны вісіць?..

— Не... Ён стаіць.

За размовай мы заходзім у залу і, вядома ж, бачым, што пасадзіць нас хацелі не на дыван (у сэнсе — не на *ковер*), а на *диван* (то-бок, на канапу): ля яе ўжо і столік накрыты...

— Во, — смяецца дзяўчынка, — а я ж думала, што *диван* — у абедзвюх мовах дыван. Ну хіба ж не дурніца?!

...Ужо, мусіць, не, калі прызнаецца? Бо шмат хто — не хоча. Для прыкладу — рэкламнае: «*Тот, кто утром кофе пьет, // Целый день не устает*», нехта са «знаўцаў» беларускай пераклаў як: «Той, хто ранкам каву п'е, // Цэлы дзень не ўстае».

І потым яшчэ доўга даказваў, што гэта — правільна, бо ёсць жа ў беларускай мове слова «ўставаць»?!.

### Свае і чужыя

...Соню з Маркам лёс некалі звёў (у школе, за першай партай), і ён жа потым развёў, бо пасля інстытута дзяўчына вярнулася ў родную вёску, а хлопец, вайсковец, паматаўся па свеце ды асеў у іншай краіне.

Надоечы да бацькоў прыязджаў. Выпадкова сустрэліся.

— *Ты в отпуске уже была?* — спытаў, між іншым.

— Не, у канцы верасня, — адказала яна.

— *Это когда?*

— Ды праз пару тыдняў, у верасні, — паўтарыла яшчэ раз.

А ён узяў ды пакрыўдзіўся, сказаў:

— *Да брось ты цепляться за этот язык, говори па-человечески...*

...Калі б гэта казаў нехта іншы, яна, відаць, зразумела б і махнула рукой: сабака брэша — вецер носіць. А так...

Свой жа, як быццам. І такі чужы!

### Кот і кат

...Бяда ў гэту сям'ю прыйшла з хваробай — часцяком — сапраўды невылечнай. Але ж яны змагаліся. І нават выйгралі — больш за тысячу дзён жыцця, цягам якіх жанчына хадзіла па зямлі, дыхала, мела шчасце бачыць сваіх любых сямейнікаў і свой дом.

Цяпер такіх жаданняў няма. Ёсць іншае і толькі адно — сысці. Не пакутаваць болей самой і не бачыць, як пакутуюць з ёю дзеці, а найболей — муж...

Надоечы, каб хоць трохі развеяцца, ён узяў «адгул»: у спецыяльную сумку пасадзіў ката, сеў у электрычку, паехаў на лецішча. Паглядзеў там на лес, пагаварыў з людзьмі, сабраў трохі ягад, па прывычцы — нарэзаў для жонкі кветак... Кот — як заўсёды і ўвесь гэты час — хадзіў за ім следам, ці, звесіўшы хвосцік, сядзеў на слупку. Гаспадар гэта бачыў.

А сабраўся з'язджаць — Барса няма. Стаў клікаць — на пошук падняў суседзяў, а найбольш — іх дзяцей. У выніку Барса, агульнага любімчыка, усё ж знайшлі (дзякуй богу, дарослыя!) — у недалёкай канаве, з праламаным чэрапам, з вырваным сэрцам...

Што далей было, гаспадар не помніў. Адзінае, чаму рады быў (і тады, і цяпер), дык гэта таму, што... хварэе жонка: што яе не было з ім поруч, што яна не бачыла гэтай жуды.

Больш за тое, яна ў сваім цяперашнім стане ўжо не спытае пра Барса. А значыць, яму не прыйдзецца хлусіць, не прыйдзецца расказваць ёй пра ката ці катаў, што аднекуль жа бяруцца?.. Што — у аблічы людзей — ходзяць па іх жа сцежках...

І зямля іх неяк трывае.

### Поза

З правілаў жыцця: тэлевізар лепш не глядзець, хіба ў кухні і, вядома ж, выбраўшы канал... Што сёння, між іншым, не так і проста, бо на адным — рэклама, на другім — чарговыя бандыцкія разборкі, на трэцім — двое ў ложку, а на чацвёртым — зноў рэклама... Страляніна, кроў... Стоп: на нейкім — жанчына, сталага веку... Нешта гаворыць? Гаворыць, што ў нашай краіне ў людзей толькі дзве праблемы — як пахудзець і дзе паставіць машыну...

Выключаю — і той канал, і тэлевізар наогул, бо ўмудрэецца ж нехта жыць і не бачыць побач людзей, што гінуць ад гарэлкі, дзяцей, што растуць без бацькоў, бездапаможнай старасці... Не чуць пра беспрацоўе і безграшоўе, не ведаць пра засмечванне лясоў, пра знікненне мовы... Жыць адгарадзіўшыся, схаваўшы галаву ў пясок...

Зрэшты, а чаму б і не? Так можна. Так нават зручна. Адзінае — ненармальна, няват для страуса.

Гэта значыць, што рана ці позна, а галаву з пяску давядзецца выцягнуць, вочы — расплюшчыць. І — не выключана — горка пашкадаваць, што зрабіў гэта позна, калі шмат што ўжо не паправіць.

### Гора горкае

Сумная вестка — аўдавела сваячка. Галоўнае — чалавек яе і не хворы быў, не стары, а ўжо ж дабрэнны...

Напярэдадні цэлы дзень па гаспадарцы круціўся, увечары — яе з аўтобуса сустрэў. Разам павячэралі, посуд прыбралі, пагаварылі. Ён распарадзіўся яшчэ: ты, маўляў, спаць кладзіся, а я — навіны пагляджу.

Раніцай яна прачнулася, зрабіла снедаць, паклікала, а ён не ідзе...

«Сэрца», — потым сказалі.

...З ім, — а тым больш з дабрэнным — жыць сёння цяжка. Навіны глядзець — яшчэ цяжэй.

### Прыкмета часу

Прыяцель пасля аперацыі: пазваночнік яму ледзь не балтамі скруцілі. Доўга, бедны, ляжаў у бальніцы, потым — дома. Устаць дазволілі толькі ў карсеце.

...У ім і ў аўтобусе неяк ехаў. Толькі з месца ўстаў, каб выйсці, — нехта ў спіну піхае і...

— Э-э-э, — пужаецца, — у цябе што там, мужык?

— Бронежылет...

Спадарожнік паверыў. Больш за тое — запаважаў.

### Грошы ёсць...

З дому — на прыпынак, на трамвай, на работу... Дарога, па якой ідзеш амаль кожны дзень гадамі, якую ведаеш да дробных драбніц, не кажучы пра істотнае.

Прынамсі, ля аднаго з будынкаў гады тры таму добры асфальт «падняглі», замест яго ўсе тратуары-ходнікі выклалі пліткамі — квадратнымі, бетоннымі.

Не скажу, што ад гэтага стала зручней (асабліва жанчынам на «шпільках»), не скажу, што нашмат прыгажэй. Але ж, як кажуць, зрабіў не прапіў — хай будзе.

Калі б пабыло, а то ж у моду новыя пліткі ўвайшлі — невялічкія, фігурныя. А таму ранейшыя зноў «паднялі». Зноў працавала тэхніка, зноў шчыравалі людзі — добрае, годнае, мянялі на лепшае.

А недзе дрэннае па-ранейшаму заставалася дрэнным.

### Эстафетай

